3. Баженова, О. Д. Белорусы Москвы. XVII век / О. Д. Баженова, Т. В. Белова. – Минск : Беларус, 2013. – 472 с.
4. Булгаков, М. Преосвященный Георгий Конисский Архиепископ Могилевский / М. Булгаков. – Минск : Виноград, 2000. – 656 с.
5. Даль, В.И. Пословицы, поговорки и прибаутки русского народа : в 2 т. / В.И. Даль. – Санкт-Петербург : Литера, ВИАН, 1997. – 2 т.
6. Фасмер, М. Этимологический словарь русского языка / М. Фасмер. – 4-е изд. – Москва, 2009. – Т. 2. – С. 45-46
7. Королев, А. С. Илья Муромец / А. С. Королев. – Москва : Молодая гвардия, 2016. – 373 с.
8. Зайцев, В. В. Русские монеты XIV-XVII вв. Очерки по нумизматике / В. В. Зайцев. – М. : Издательство МБА, 2016. – 304 с.

## ДВАРАНСКІЯ СЯДЗІБЫ ВІЦЕБСКА-СМАЛЕНСКАГА ПАМЕЖЖА: СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ

*М.В. Півавар*
*г. Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава, pivavar@gmail.com*

**Мэта артыкула** – аналіз стану шляхецкіх сядзіб, выяўленне агульных і асаблівых рыс былых маёнткаў віцебска-смаленскага памежжа.

**Ключавыя словы:** сядзібы, палацава-паркавыя комплексы,дваранства.

Вывучэння дваранскіх сядзіб – важнейшы накірунак у вывучэнні культуры вышэйшых колаў насельніцтва народа. Сядзібы, як правіла, з’яўляліся гаспадарчымі, культурнымі цэнтрамі, вакол якіх арганізоўвалася жыццё ў правінцыі. Багатыя і сярэдняй рукі прагрэсіўныя памешчыкі першымі ўводзілі ў сельскую гаспадарку новыя прыёмы землеапрацоўкі, новыя механізмы, прылады працы, тэхналогіі, формы і метады землекарыстання. У панскіх сядзібах былі бібліятэкі, прыватныя архівы, калекцыі, кабінеты, часам тэатры. Часта на грошы гаспадароў адкрываліся і ўтрымліваліся навучальныя ўстановы. Шэраг сядзіб былі ўзведзены па праектах вядомых архітэктараў і з’ўляліся выдатнымі помнікамі архітэктуры свайго часу.

На жаль, у часы расійскіх рэвалюцый, а потым і сацыялістычных пераўтварэнняў падаўляючая большасць сядзіб была знішчана. Вывучэнне сядзіб, як і даследаванне дваранства разглядалася ў БССР як неперспектыўная тэма. Сама памяць пра эксплуататарскія класы павінна была сысці ў нябыт разам з эксплуатацыяй.

З канца 1960-х гг., на Беларусі ў пэўных колах грамадства (ліберальная інтэлігенцыя, мастакі, нацыянальна-арыентаваныя студэнты) з’яўляецца цікавасць да мінуўшчыны. Некаторыя захады па вывучэнню і захаванасцю сядзіб рабіла Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. У бюлетэні “Помнікі гісторыі і культуры Беларусі” можна знайсці некаторыя артыкулы на гэту тэму. Актывізацыя вывучэння стану сядзіб адбываецца ў межах падрыхтоўкі “Збору помнікаў гісторыіі культуры Беларусі”. Аднак, у яго увайшлі далёка не ўсе з тых сядзіб, якія на той час добра захаваліся. Напрыклад, у том, прысвечаны Віцебскай вобласці [1] не ўвайшлі звесткі ні пра адну сядзібу ў Віцебскім раёне, хаця ў добрым стане захавалася тры мураваныя: Мазалава, Лукі, Вялікія Лётцы.

З пачаткам палітыкі “перабудовы” і абмежавання цэнзуры панскімі сядзібамі цікавіцца пачалі больш, але тут развіццё сядзібазнаўства стрымліваецца абмежаванасцю дакументальнай базы і крыніц. Практычна адсутнічаюць даследаванні па гісторыі сядзіб у Беларусі. А.Т. Федарук у сваім даследаванні “Садово-парковое



Репозиторий ВГУ

искусство Белоруссии” [2] ускосна разглядае сядзібы ў межах аналізу садова-паркавага мастацтва краіны. Тэмай даследавання Л.М. Несцярчука сталі сядзібы Берасцейшчыны [3]. Польскі даследчык Раман Афтаназі прысвяціў 12-томнае выданне стану сядзіб на былых ускраінах Рэчы Паспалітай. У томе 1 і 4-м можна знайсці некаторыя звесткі пра былыя сядзібы на тэрыторыі сучаснай Віцебшчыны [4]. Пэўныя звесткі пра сядзібы ў некаторых раёнах вобласці можна адшукаць інфармацыю ў артыкулах і выданнях мясцовых краязнаўцаў.

Такім чынам, відавочна, што пытанне вывучэння сядзіб Беларусі ў цэлым і Віцебшчыны ў прыватнасці пакуль не знайшло свайго даследчыка. Інфармацыя пра сядзібы адрывачная, непэўная, расцярушана па розных выданнях. Невядома нават, колькі сядзіб было. Не толькі з прычыны маладаследаваннасці гэтага пытання ці адсутнасці інфармацыі. Выклікае пытанне Што лічыць сядзібай? Стан і ўзровень сядзіб быў вельмі розным. Былі мураваныя палацы, выкананыя па праектах выдатных замежных і расійскіх архітэктараў, узвядзенне якіх каштавала сотні тысяч, а то і некалькі мільёнаў злотых, а потым рублёў. Былі і сціплыя драўляныя аднапавярховыя сядзібы дробнай шляхты, якія па сваім выглядзе і архітэктуры мала адрозніваліся ад сялянскіх хат.

Жыццё сядзібы ў любым грамадстве абмяжоўваецца трываласцю матэрыялаў, з якіх яна створана, дбайнасцю гаспадароў, прыроднымі (землятрус, навадненне, пажар і інш.) і сацыяльнымі (войны, рэвалюцыі, паўстанні) з’явамі. Але большасць памешчыцкіх сядзіб, якія былі ўзведзены на Беларусі ў XVIII – пачатку XX ст. загінула ад рук людзей. Прычым, не ў ваенных канфліктах, у выніку сацыяльных патрасенняў.

Першая хваля пагромаў памешчыцкіх сядзіб адбылася ў 1905–1907 гг. і звязана з Першай расійскай рэвалюцыяй. Палілі сядзібы, як казаў Бунін “за тое, што сотнямі гадоў паролі мужыкоў і гвалцілі сялянак”. Сіламі паліцыі і войскаў бунты задушылі. Але нявырашанасць менавіта аграрнага пытання прывяла да Лютаўскай рэвалюцыі. Сядзібы запалалі зноў. А пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, калі лозунг “Рабуй нарабаванае!” адзінае не стаў афіцыйнай ідэалогіяй сядзібам, панскім гаспадаркам быў нанесены найбольшы ўдар.

Што сталася з былымі валадарамі сядзіб? Большасць памешчыкаў-каталікоў выехалі ў Польшчу. Больш багатыя праваслаўныя памешчыкі выехалі куды маглі – Францыю, Германію, Кітай. Дробныя і памешчыкі сярэдняй рукі аставаліся, разлічваючы на тое, што змогуць прыстасавацца. Некаторым некаторыя час удавалася, але не доўга. Як прадстаўнікоў эксплуататарскіх класаў іх пазбаўлялі маёмасці, выбарчых праў, а з 1930-х гг. і жыцця.

Як жа сядзібы захаваліся. Найбольш багатыя савецкая ўлада імкнулася пераўтварыць ва ўзорныя гаспадаркі. Яны былі павінны стаць ачагамі дзяржаўных маёнткаў па вырабу сельскагаспадарчай прадукцыі. Тут ажыццяўляліся і першыя спробы сацыяльнага эксперэменту: на аснове былых сядзіб рабіліся першыя камуны. Але большасць іх развалілася, калі праелі памешчыцкія запасы. Да і кадраў, якія былі здольны кіраваць эканомікай вялікай гаспадаркі проста не было.

У некаторых сядзібах рабілі школы, лячэбныя ўстановы, у некаторыя ўсяляліся арганізацыі.

Улада пыталася зрабіць пэўныя захады па захаванню сядзіб і маёмасці. Так, пытаннем аховы сядзіб займалася Віцебская губернская Камісія па ахове помнікаў даўніны і прадметаў (рэчаў) мастацтва (студзень 1920 –мяжа 1921–1922 гг.). У Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці захоўваюцца анкеты на некаторыя сядзібы, якія запоўнены рукой вядомага гісторыка А.П. Сапунова (фонд 1947, воп. 1, спр. 2, 19). Планавалася скласці каталог сядзіб, узяць іх пад ахову. Але перапіска сведчыць аб тым, што справа аховы ішла малапаспяхова.



Рэпазіторый ВДУ

Непапраўную шкоду нанеслі сядзібам і гаспадарцы ў цэлым далучылася Першая сусветная, а потым савецка-польская вайна. Шмат загінула і ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Апошні ўдар сядзібам нанесены у канцы XX ст., калі з развалам СССР і жыццём ва ўмовах пераходу да капіталізму рэзка паменшылася фінансаванне сацыяльнага сектару дзяржавы. Скарачаюцца выдаткі а разам з гэтым і ліквідуюцца, “аптымізуюцца” санаторыі, прафілакторыі, дзіцячыя дамы, дзіцячыя садкі, школы, навучальныя і выхаваўчыя ўстановы. Некаторыя з іх размяшчаліся ў былых сядзібах. Будынкі, аказаўшыся без прысутнасці чалавека закідваюцца, прыходзяць у кепскі стан, руйнуюцца, гараць. Большасць з тых, перажылі жорсткае XX стагоддзе, з ягонымі войнамі, пагромамі рушацца ад нядбайнасці сучаснікаў.

*Сядзібы віцебска-смаленскага памежжа*. У Віцебскай вобласці са Смаленскай мяжуюць 3 раёна: Віцебскі, Дубровенскі і Лёзненскі. Толькі ў адным Віцебскім павеце на 1906 г. было 146 сядзіб [5]. На 2016 г. не разбуранымі з’яўляюцца толькі сядзібы ў Вялікіх Лётцах, Здраўнёва і Мазалава. Ад 36 удалося адшукаць у лепшым разе падмуркі, руіны гаспадарчых пабудоў ці фрагменты паркаў.

У Дубровенскім удалося выявіць фрагменты толькі чатырох сядзіб: Арловічы, Дуброўна, Станіславава, Усвяты. У Лёзненскім – 9: Адаменкі, Дабрамыслі,Завольша, Крынкі, Перамонт, Станіславова, Страганы, Міхайлава, Чарнаручча. З іх толькі ў Крынках захаваліся конны манеж, скотны двор, сіласныя ямы, сістэма сажалак.

На Смаленшчыне навукоўцамі даследавана 350 адрасоў, выяўлена 253 аб’екта. З іх у рознай ступені захаванасці 33 сядзіб з галоўнымі дамамі; 4 сядзібы без дамоў, але з жылымі флігелямі. Ад 30 сядзіб захаваліся толькі цэрквы, ад 177 захаваліся толькі паркі ці іх фрагменты. Зусім не захавалася сядзіб у Веліжскім раёне.

У памежным з Віцебскай вобласцю Руднянскім раёне на месцы двух сядзіб захаваліся толькі некаторыя старыя дрэвы ў вв. Казімірава і Храпакі (Храпакова). У Дзямідаўскім рёне выяўлены 12 сядзіб, з іх большасць не захавалася. Але ў в. Слабада (п. Прожевальское) захавался сядзіба Глінак і Пржавальскіх. У 1887 г. вядомы генерал-выпрабавальнік М. Пржэвальскі пабудаваў тут па сваім праекце драўляны дом з мезанінам. Дом згарэў у 1942 г., але адноўлены ў 1975 г., у 1989 г. старожка (дом Глінак). З 1977 г. у сядзібе створаны Дом-музей М. Пржавальскага [6].

Такім чынам, лёс і цяперашні стан памешчыцкіх сядзіб на тэрыторыі сучасных Усходняй Віцебшчыны і Заходняй Смаленшчыны быў прыблізна аднолькавы. Большасць была спалена і разрабаваная сялянамі. Значная колькасць разабрана ўладамі для стварэння школ, будынкаў сельскіх саветаў. Некаторыя страціўшы гаспадароў былі закінуты і проста не перанесла часу. Некаторыя былі знішчаны ў часы ваенных дзеянняў Першай і Другой сусветнай войнаў. Толькі некаторыя мелі больш шчаслівы лёс. У іх былі адчынены школы, бальніцы, прафілакторыі. Некаторыя аддадзены пад ўстановы. Большасць страціла сваё эканамічнае значэнне і толькі адзінкі працягвалі быць цэнтрамі сельскагаспадарчай вытворчасці. Аднак з распадам СССР, развіццём капіталізму і звязаным з гэтым рэзкімі зменамі ў сацыяльнай палітыцы амаль усе былыя памешчыцкія сядзібы (былыя санаторыі, прафілакторыі, школы) закінуты ўладамі і можна прагназаваць іх знікненне на працягу некалькіх гадоў. У такой сітуацыі выхадам бачыцца тэрміновая прыватызацыя былых сядзіб і неабходныя захады хаця бы па іх кансервацыі.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць. – Мн., 1985. – 496 с.
2. Федорук, А.Т. Садово-парковое искусство Беларуси / А.Т. Федорук. – Мн.: Ураджай, 1989. – 247 с.
3. Несцярчук, Л.М. Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X–XX стагоддзяў : Гісторыя, стан, перспектывы / Л.М. Несцярчук. – Мн. : УП "БЕЛТА", 2002. – 336 с.



Репозиторий ВГУ

4. Aftanazy, R.Dziejerezydencjinadawnychkresach Rzeczypospolitej. – Wyd. 2. – Cz. 1. WielkieKsięstwoLitewskie, Inflanty, Kurlandia. – **T. 1**. Województwamińskie, mścisławskie, połockie, witebskie. – Wrocław: Ossolineum, 1996. – 335 S.; Aftanazy, R.Dziejerezydencjinadawnychkresach Rzeczypospolitej. – Wyd. 2. – Cz. 1. Wielkie Księstwo Litewskie, Inflanty, Kurlandia. –T. 4. Województwo wileńskie. – Wrocław: Ossolineum, 1993. –547 S.
5. Сапунов, А.П. Список населенных мест Витебской губернии. – Витебск, 1906. – С. 3–6, 11–30, 32–46, 53–54
6. Чижков, А.Б., Гурская, Н.Г. Смоленские усадьбы. Каталог с картой расположения усадеб. – Смоленск: Свиток, 2009. – С. 50.

## ГОРОДСКОЕ НАСЕЛЕНИЕ ВИТЕБСКОЙ И КАЛИНИНСКОЙ ОБЛАСТЕЙ В 1920–1930 ГОДЫ: ДИНАМИКА ЧИСЛЕННОСТИ И НАЦИОНАЛЬНЫЙ СОСТАВ

*М.И. Старовойтов*
*г. Гомель, ГГУ имени Ф. Скорины, starmihail24@mail.ru*

**Цель статьи** – на основе компаративистского метода раскрыть динамику численности городского населения, степень урбанизированности населения пограничного региона и, прежде всего, белорусов, достигнутый к концу 1930-х годов в результате советской модернизации экономики.

**Ключевые слова:** Витебская и Калининская области; городское население; динамика численности; национальный состав; титульные этносы; степень урбанизированности населения

Исследование региональных, пограничных аспектов развития того или иного государства является одним из главных направлений в изучении общего и особенного исторического процесса. Ни в общереспубликанском, ни в региональном плане в таком контексте обозначенная проблема в отечественной и российской историографии не только не рассматривалась, но и не ставилась. Автором предпринята попытка, с учетом возможного объема публикации, восполнить этот пробел, опираясь на оригинальные рассекреченные архивные данные, которые вводятся в научный оборот впервые (таблицы составлены и проценты подсчитаны автором). Частично опубликованные материалы переписи 1939 г. носят общий характер [1].

Из таблицы 1 [2, л.1; 3, л.1] видно, что в Витебской области прирост городского населения составил 157%, а в Калининской – 186%. Этот прирост произошел в основном за счет сельского населения, которое значительно уменьшилось в исследуемый период. Удельный вес городского населения в составе всего населения Витебской области увеличился с 17,4% в 1926 г. до 26,8% в 1939 г., а в Калининской соответственно – с 10,8% до 21,9%, что свидетельствует о более высоких темпах промышленного развития последней.

Рост удельного веса женщин в составе городского населения, в Витебской области он был несколько ниже, чем в Калининской области. Это связан с развитием отраслей легкой промышленности, последствиями Первой мировой войны, революции, гражданской войны, учеба, работа служба в армии за пределами своих областей, последствиями репрессий, от которых больше пострадали мужчины, более высокой их смертности и др. причин, приведших к уменьшению абсолютной и относительной численности мужского населения в составе всего населения соотносимых областей. К концу 1930-х годов девушки активно стремились в города не только на работу, но и на учебу.



Репозиторий ВГУ